Их трактовка из плоскостной меняется на объемно-светотеневую, многоцветную с обогащением золотом и серебром. В построении мотивов сохраняется симметрия, однако раппорт постепенно вытягивается по вертикали. Выделение группы мебельных тканей приводит к расширению тем текстильных рисунков: среди цветов и листьев появляются архитектурные детали, пейзажи, скалы, фонтаны, детали кораблей. Ценность мотива повышается, фон, как и прежде, имеет меньшее значение, остается гладким и одноцветным, хотя уже отмечается тенденция к его усложнению. На узоры тканей начинает оказывать влияние декор другого вида текстиля – кружевоплетения. Разрабатываются рисунки, создающие впечатление ажурных кружев, а также меха.

Текстильный орнамент в своей структуре, выборе и трактовке мотивов продолжает развивается в рамках того или иного художественного стиля. Уровень развития текстильного производства, как, например, появление ткацкого станка К. Дангона, Ж.М. Жаккара, применение новых технологий, например, развитие ксилографии, стимулировавшей распространение набойки, находит отражение в формировании орнаментальной базы. В последующем роль текстиля заметно возрастает и орнамент в нем занимает ведущие позиции в формообразующих художественных процессах.

**Список литературы:**


1. Соколова, Т. Орнамент – почерк эпохи // Т. Соколова. − Л. : Аврора, 1972. – 148 с.
2. Дучыц, Л. Касцюм жыхароў Беларусі X-XШ стст. (паводле археалагічных звестак) / Л. Дучыц. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.
3. Кибалова, Л. Иллюстрированная энциклопедия моды / Л. Кибалова, О. Гербенова, М. Ламарова. – Прага : Артия, 1966. – 608 с.
4. Седунова, Т. Византийская ткань как зеркало церемониальности / Т. Седунова // Труды Санкт-Петербургского государственного института культуры [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: https://www.cyberleninka.ru/article/n/vizantiyskaya-tkan-kak-zerkalo-tseremonialnosti. – Дата доступа : 10.03.2018.
5. Моран, А. История декоративно-прикладного искусства / А. Моран. − М. : Искусство, 1982. – 578 с.



*Алена Шылкіна*


**ПРАБЛЕМЫ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ МАСТАЦКА АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ СРОДКАМІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ХАРЭАГРАФІІ**


*Аўтар разглядае акалічнасці і прыярытэты працы харэографа с энаграфічнымі першакрыніцамі па стварэнні мастацкага твора для дзяцей на матэрыяле народнага танцавальнага фальклору.*



*Elena Shilkina*


**PROBLEMS OF TRAINING AND EDUCATION ARTISTICALLY GIFTED CHILDREN AND YOUNG PEOPLE BY THE MEANS OF NATIONAL CHOREOGRAPHY**


*The author examines the circumstances and priorites of the work of the choreographer with ethnographic source material to create a work of art for children in folk dance folklore material.*


Рашэнне праблемы навучання і выхавання мастацка адораных дзяцей і моладзі сродкамі нацыянальнай харэаграфіі звязана, у першую чаргу, з пытаннямі эстэтычнага выхавання, авалодання выканальніцкімі і акцёрскімі навыкамі, сістэмай выразных сродкаў беларускага танца, а таксама развіццём наглядна-дзейснага і абстрактна-тэарэтычнага мыслення ў працэсе заняткаў танцам у школах, аматарскіх калектывах, сярэдніх і вышэйшых прафесійных установах. У больш агульным плане яно тычыцца праблем выхавання нацыянальнай самасвядомасці, павагі і ведаў традыцыйнага мастацтва і культуры свайго народа, якія павінны вырашацца комплексна ўсімі ўстановамі культуры і адукацыі.

Сёння вельмі часта сучасную моладзь абвінавачваюць у тым, што яна цураецца нацыянальнага мастацтва, у тым ліку і харэаграфічнага, што ім да спадобы супермодныя рытмы, а беларускія танцы зведзены ў ранг не прэстыжных. Справа ў тым, што намі згублена бытавая нацыянальная традыцыя. З усяго арсенала нацыянальных танцаў зараз існуе полька і гарадскія бытавыя танцы, і то ў самай прымітыўнай форме. Такое няведанне традыцыі тычыцца не толькі моладзі, але і больш дарослых людзей, якія не памятаюць сваіх нацыянальных каранёў, больш за тое, ніколі не ведалі і не разумелі асаблівасцяў і значэння роднай культуры, таму былі не здольныя прывіць любоў да народнай творчасці сваім дзецям. Вынікі такой палітыкі мы назіраем сёння, калі моладзь не лічыцца з законамі і звычаямі зямлі, на якой жыве, не паважае вопыт продкаў.

Фальклор – гэта не толькі відовішча, але ў першую чаргу, скарбніца, у якой сабраны стогадовы вопыт продкаў ва ўсіх відах жыццядзейнасці, у тым ліку і ў выхаванні дзяцей, перадачы ведаў, выпрацоўцы нормаў паводзін у грамадстве. Таму ўсе спосабы абнавіць бытавую танцавальную традыцыю, вяртанне да фальклорнай харэаграфіі ў навучальным працэсе і пры стварэнні сцэнічных твораў будуць садзейнічаць развіццю таленавітых дзяцей і моладзі, якія будуць ведаць нацыянальныя традыцыі і памяркоўна ставіцца да культуры іншых народаў [2].

Адным са шляхоў перадачы фальклорнага танца было сумеснае стварэнне яго дарослымі і дзецьмі падчас выканання.Таму радуе творчы вопыт, які атрымліваюць дзеці-ўдзельнікі этнаграфічных і фальклорных калектываў. Найбольш цікавыя фальклорныя калектывы, у якіх дзеці вывучаюць традыцыі свайго краю, атрымліваюць комплекснае выхаванне, назіраюць за тым, як танцуюць старэйшыя аднавяскоўцы, пераймаюць манеру выканання, вучацца спяваць, граць на музычных інструментах, насіць святочны касцюм, паводзіць сябе згодна са святочнай атмасферай выступлення перад гледачамі. Гэта Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фальклорны ансамбль «Берагіня» дзяржаўнай установы адукацыі «Мётчанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа Барысаўскага раёна», фальклорны ансамбль «Крыніца» Капаткевіцкага гарадскога дома культуры Петрыкаўскага раёна, ансамбль народнага танца «Крынічка» (дзіцячая школа мастацтваў г. Добруш), ансамбль бытавога танца «Ютрань» Міханавіцкага Дома фальклору Мінскага раёна, дзіцячы фальклорны ансамбль «Вясейка» Вясейскай дзіцячай школы мастацтваў Слуцкага раёна, фальклорны гурт «Жэўжык» Любаньскага раённага цэнтра культуры (г. Любань), фальклорны калектыў «Верабейкі» Любаньскага раённага цэнтра культуры (г. Любань), фальклорны калектыў «Мілавіца» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г. Мінска.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзел у рабоце падобных калектываў спрыяе раскрыццю творчага патэнцыялу асобы. Акрамя вывучэння танцавальнай традыцыі, дзеці атрымліваюць навыкі імправізацыі, калектыўнай творчасці, выпрацоўваюць фарміраванне эстэтычнага ідэалу, у іх выхоўваюцца найлепшыя маральныя якасці.

Вялікую ролю ў вырашэнні праблемы навучання і выхавання мастацка адораных дзяцей сродкамі нацыянальнай харэаграфіі павінна адыграць ўвядзенне школьнай і дашкольнай адукацыі на аснове беларускай культуры. Азнаямленне вучняў з узорамі беларускага танцавальнага і дзіцячага фальклору вырашае задачы развіцця харэаграфічных навыкаў аб авалоданні сістэмай выразных сродкаў нацыянальнага танца. Выкарыстанне узораў фальклорнага мастацтва – масавых іграве карагодаў, танцаў, прыпевак, песень у навучальным працэсе садзейнічаюць развіццю выканальніцкіх акцёрскіх навыкаў, прадугледжвае прымяненне сродкаў народнай педагогікі. Найбольш эфектыўнымі прыёмамі перадачы ведаў тут з'яўляюцца перайманне і імітацыя. Іх мэта – навучанне падчас гульні асноўным працоўным працэсам і асаблівасцям адносін паміж членамі соцыуму, перадача вопыту продкаў.

Выкарыстанне ўзораў дзіцячага харэаграфічнага фальклору служыць развіццю ў дзяцей наглядна-дзейснага, наглядна-вобразнага і абстрактна-тэарэтычнага мыслення і стварэнню творчай атмасферы на занятках. Акрамя таго, вывучэнне асаблівасцяў беларускай музычнай і харэаграфічнай творчасці, народнага касцюма, рамёстваў, побыту розных рэгіёнаў Беларусі пашырае кругагляд навучэнцаў, фарміруе агульны культурны ўзровень.

Сучаснае харэаграфічнае аматарскае мастацтва шырока выкарыстоўвае ўзоры беларускага фальклору. Адным з найбольш значных дасягненняў можна лічыць стварэнне спецыяльнага дзіцячага рэпертуару на аснове інтэрпрэтацыі беларускіх танцаў і узораў дзіцячага фальклору. Такім чынам вырашаны адразу два пытанні: пашырэнне кола крыніц для інтэрпрэтацыі і пошук арыгінальнасці і самабытнасці танцавальнымі калектывамі. Выкарыстанне твораў дзіцячага фальклору дапамагае ствараць цікавыя нумары, якія адпавядаюць узроўню мыслення, развіццю і ўспрыманню дзяцей, апеpуюць колам яркіх казачных вобразаў, ствараюць атмасферу радасці і больш адпавядаюць здольнасцям дзяцей, чым нумары, якія былі перанесены з рэпертуару дарослых калектываў. Акрамя таго, удзельнікі такіх калектываў далучаюцца да нацыянальнага мастацтва, выхоўваюцца на яго найлепшых узорах. Прыкладам падобнага падыходу да інтэрпрэтацыі фальклору з'яўляецца дзейнасць многіх харэаграфічных калектываў: Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Равеснік», «Весялушка», «Раўніца», «Беларусачка», «Першацвет», «Пралесачка», «Жаваронaчкі», «Дзянніца», «Сузор'е», «Цягнічок»і інш.

Назвы харэаграфічных нумароў кажуць самі за сябе: «Упартыя конікі», «Кавалік», «Пчолка», «Верабей», «Бусліны край», «Лялькі», «Каза», «Воран», «Крутуха», «Лявоніха», «Таўкачыкі», «Мурашыная будоўля», «Вераб'і і лежань».

Неабходна звярнуць увагу на шырокія магчымасці, якія адкрываюцца пры выкарыстанні ўзораў традыцыйнага фальклорнага мастацтва пры падрыхтоўцы спецыялістаў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў культуры. У першую чаргу гэта тычыцца вопыту творчага выкарыстання фальклорных узораў для стварэння харэаграфічных нумароў у рамках курса мастацтва балетмайстра кафедры харэаграфіі БДУКМ, адным з этапаў якога з'яўляецца стварэнне харэаграфічнага твора на фальклорным матэрыяле. Падбор матэрыялу прадугледжвае азнаямленне студэнта з матэрыяламі фальклорных экспедыцый і творчую работу з фальклорнымі крыніцамі ў лабараторыі і бібліятэцы, а таксама пошук дадатковай інфармацыі ў зборніках і манаграфіях па музычным фальклоры, вуснай народнай творчасці, традыцыях, абраднасці, народным касцюме.

Важным з'яўляецца валоданне прыёмамі апрацоўкі фальклорнага ўзору, падпарадкаванне патрабаванням беражлівых адносін да фальклорнага ўзора і арыентацыя на навізну і арыгінальнасць [1].

Такім чынам, рашэнне навучання і выхавання мастацка адораных дзяцей і моладзі сродкамі нацыянальнай харэаграфіі патрабуе комплекснага падыходу і звязана з шэрагам прафесійных педагагічных і харэаграфічных пытанняў.

**Спіс літаратуры:**


1. Козенка, М. Традыцыйная культура і дзеці / М. Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2004. – 288 с.
2. Чурко, Ю. Белорусский хореографический фольклор: традиции и современность / Ю. Чурко. – Минск : Четыре четверти, 2016. – 388 с.



***Ирина Коновальчик***


**АКТУАЛИЗАЦИЯ ТАНЦЕВАЛЬНОГО ФОЛЬКЛОРА В СОВРЕМЕННОМ ХОРЕОГРАФИЧЕСКОМ ИСКУССТВЕ**


*Автор статьи рассматривает поиск путей актуализации танцевального фольклора в область современного хореографического искусства. Этот процесс в каждой национальной хореографической системе позволит сформировать новый актуальный художественный язык, соответствующий уровню развития мирового искусства, но основанный на национальном лексическом фонде.*



***Irina Konovalchyk***


**ACTUALIZATION OF DANCE FOLKLORE IN CONTEMPORARY CHOREOGRAPHIC ART**


*The author of the article considers the ways of actualization of dance folklore in the field of modern choreographic art. This process in each national choreographic system will allow to form a new actual artistic language, corresponding to the level of development of world art, but based on the national lexical fund.*


Белорусский танцевальный фольклор является уникальным явлением в общемировом хореографическом пространстве, так как выступает в роли демонстранта историко-культурной самобытности народа. Национальное



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ